УДК 355

# УРАДЖЭНЦЫ БЯЛЫНІЦКАГА РАЁНА НА ФРАНТАХ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

А.М. ДЗЯМ'ЯНКА
Навучны рукавадіцель С.Я. МАКАРАВА, канд. гіст. наук, дац.
ГУ ВПО «БЕЛАРУСКА-РАССІЙСКІ УНІВЕРСІТЭТ»

Ураджэнец вескі Вялікі Трылесін Людзвіг Іванавіч Сяліцкі ў гады вайны разам з К.С. Заслонавым разгортваў партызанскі рух на Аршаншчыне, камандваў з лістапада 1942г. партызанскай брыгадай імя К.С. Заслонава.

У 21 год шагнуў у бессмяроцце лётчык гвардыі, малодшы лейтэнант Мікалай Мінчанкоў.27 верасня 1943г. экіпаж, членам якога быў Мікалай, вяртаўся з задання.Самалет быў збіты і лётчыкі трапілі ў палон.Гітлераўцы сталі іх дапытваць пра авіяполк. Калі гестапавец стаў дапытваць Мінчанкова, той плюнуў яму ў твар.Звар'яцелыя фашысты аблілі лётчыка бензінам і падпалілі.

Цяжкімі франтавымі дарогамі прайшла ўраджэнка вёскі Свяцілавічы Алена Іванаўна Шарснева. Пасля заканчэння медыцынскага вучылішча, яна, як большасць медыцынскіх работнікаў, была мабілізавана на фронт.Алена Іванаўна выносіла параненых у 1941г. на Гомельшчыне, у 1942 – пад Варонежам, у 1943 – на Курскай дузе. Ратныя подзвігі Алены Іванаўны адзначаны ордэнам Чырвонага Сцягя, Чырвонай Зоркі, медалямі.

Слаўны баявы шлях за плячыма Героя Савецкага Саюза Мікалая Трафімавіча Кітаева. Ён удзельнік савецкага-фінляндскай вайны. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Трафімавіч на фронце.Пачынаў камандзірам авіязвяна, а закончыў вайну ў званіі маёра, камандзірам палка.За час баёў асбіста збіў 27 фашыстскіх сцярвятнікаў і яшчэ 8 – у групавых баях. Узнагароджаны шматлікімя ордэнамі і медалямі.

У 1941г. ураджэнец вёскі Пачапок Мікалай Максімавіч Філіповіч 17-гадовым юнаком-дабравольцам пайшоў на фронт. Удзельнічаў у абароне Масквы, вызваляў Беларусь, штурмаваў Кёнігсберг, прымаў удзел са сваім артылерыйскім узводам у разгроме мілітарыстскай Японіі.Мужнасць М.М. Філіповіча адмечана двума медалямі "За адвагу".

Вялікая Айчынная вайна была самым цяжкім выпрабаваннем, якое выпала на долю савецкага народа. Нягледзячы на вялікія людскія і матэрыяльныя страты, наш народ выйшаў пераможцам і свій уклад у перамогу зрабілі тысячы белынічан.